Miejsce
na naklejkę
z kodem szkoły

dysleksja

MOB-R1A1P-062

EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

Arkusz II

POZIOM ROZSZERZONY

ARKUSZ II

MAJ
ROK 2006

Czas pracy 130 minut

Instrukcja dla zdającego

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 9 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie podlegają ocenie.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Wypełnij tę część karty odpowiedzi, którą koduje zdający. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.
7. Na karcie odpowiedzi wpisz swoją datę urodzenia i PESEL. Zamaluj ■ pola odpowiadające cyfrom numeru PESEL. Błędne zaznaczenie otocz kółkiem ◉ i zaznacz właściwe.

Życzymy powodzenia!

Za rozwiązanie wszystkich zadań można otrzymać łącznie
40 punktów

Wypełnia zdający przed rozpoczęciem pracy

PESEL ZDAJĄCEGO

KOD ZDAJĄCEGO

Arkusz zawiera dwa tematy sprawdzające umiejętność pisania własnego tekstu w związku z tekstem literackim znajdującym sie w arkuszu. Wybierz jeden z nich i napisz wypracowanie. Wybrany temat podkreśl

Тэма 1: **Значэнне роднай мовы для беларусаў на аснове параўнаўчага аналізу і інтэрпрэтацыі твораў: *Беларускаму слову* Сакрата Яновіча і *Слова, ты роднае слова* Віктара Шведа.**

Сакрат Яновіч

Беларускаму слову

Беларускае слова, ты мая айчына! Мой сон ля акна цвета-ліпнёвага ў раніцу пчаліную. І пошум пушчы стрункахвойнай, і весялосць густазялёная. Ты, як дзяцінства, ідзеш за мною.

Слова матчынае, ты мая сляза! Мая трывога ў вечары кахання чыстаквяцістага, у садзе юнацтва. І чарнабрывы позірк дзяўчыны сарамлівай і бяссонне зорнае. Ты, як лёс паўстаеш, у даляглядзе нязбытым.

Слова роднае, суме мудры! Радасць неўгамонная, што часам лунае вясёлкаю на небе краіны майго прызначэння. І няспешна павучаеш мяне жыць сваім розумам ды гасцінцам ісці шырокім праз годы ўсяго раз адзін дадзеныя. Ты, як той сябар шчыры, не пакінеш і ў няшчасці.

Я табе толькі, слова ты маё беларускае, веру ды кланяюся.

Бог ты мой!

Ты мая рэлігія!

Віктар Швед

Слова, ты роднае слова

Слова - маё дарагое.
Слова - радзіўся з табою.
Слова - нясу праз жыццё.
Слова - не йдзі ў забыццё.
Слова - ў табе закаханы.
Слова - з табою з'яднаны.
Слова - нашу цябе ў сэрцы.
Слова - не будзь у паняверцы.
Слова - к табе я малюся.
Слова - цябе не зракуся.
Слова - ты клятва мая.
Слова - з табой заўжды я.
Слова - што іншым дару.
Слова - з табою памру.
Слова - ты роднае слова,
Мая беларуская мова.

С. Яновіч, *Слова, ты роднае слова* (w:) *Беларуская скарбніца*, Warszawa 1993, s. 308

Temat 1.

Значэнне роднай мовы ў жыцці чалавека – частая тэма творчых роздумаў многіх паэтаў, пісьменнікаў і філосафаў, якія ў творах выказваюць свае адносіны да яе.

Лёс беларускай мовы на працягу гісторыі складваўся па-рознаму. У Вялікім княстве Літоўскім яна выконвала функцыю дзяржаўнай мовы. Гэта быў безумоўна перыяд яе росквіту. У сярэдзіне XVII стагоддзя наступае заняпад беларускай мовы. Беларускаму народу забаранялася карыстацца сваёй роднай мовай. Аднак у XIX стагоддзі Францішак Багушэвіч у прадмове да зборніка «Дудка беларуская» напісаў: «Шмат было такіх народаў, што страцілі наперш мову сваю, так як той чалавек прад скананнем, катораму мову займае, а потым і зусім замёрлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі!»

Сакрат Яновіч і Віктар Швед гэта нараджэнцы Беласточчыны, аднак па нацыянальнасці яны беларусы, і беларуская мова з'яўляецца іх роднай мовай. Менавіта таму ўсхваляюць і апяваюць яе ў сваёй творчасці. Складаючы творы на беларускай мове, яны застаюцца ёй адданымі.

Творы «Беларускаму слову» Сакрата Яновіча і «Слова, ты роднае слова» Віктара Шведа, розныя і падобныя адначасова. Аўтары карыстаюцца іншай формай выказвання, Сакрат Яновіч – паэтычнай прозай, а Віктар Швед – паэзіяй, каб закрануць гэтую ж самую праблематыку – значэнне роднае мовы для беларуса.

Прадказанне важнай ролі зместу і праблематыкі твораў можам ужо заўважыць у загалоўках. У творы Сакрата Яновіча загаловак гучыць «Беларускаму слову». Здаецца, аўтар хоча дадаць: кланяюся, малюся, ствараю помнік, аддаю ўсё, што маю. Віктар Швед даў свайму вершу загаловак: «Слова, ты роднае слова», які з'яўляецца непасрэдным зваротам да мовы. Лірычны герой верша хоча, каб яго словы былі пачуты, каб адрасат верша, якім з'яўляецца мова, пачуў яго шчырыя прызнанні:

«Слова – маё дарагое. […]
Слова – ў табе закаханы. […]
Слова – нашу цябе ў сэрцы. »

і абяцанні:

«Слова – цябе не зракуся. […]
Слова – з табою памру. »

Аўтар выкарыстаў анафару, як мастацкі сродак, вельмі трапны ў гэтым месцы, каб падкрэсліць важнае і вялікае значэнне роднай мовы для лірычнага героя. Кожны радок верша, апрача апошняга, пачынаецца са «слова». Гэта можа рабіць уражанне, што «слова» сапраўды чуе ўсё сказанае лірычным героем. Прызнанні лірычнага героя здаюцца вельмі шчырымі і асабістымі, можна сказаць, што нават інтымнымі. Ён закаханы ў сваёй роднай мове, моліцца ёй.

Мова прысутная ў нашым жыцці і жыцці кожнага чалавека, ад самага пачатку яго зямельнай вандроўкі:

«Слова – маё дарагое.
Слова – радзіўся з табою.»

Дзіця, толькі што народжанае, якое яшчэ нічога не разумее, ужо чуе галасы бацькоў, потым расказы ці казкі, якія чытае маці, калыханкі, якія спявае, каб яно хутчэй заснула і спакойна спала. Дзякуючы гэтаму ўсяму вучыцца мове, якую потым, ужо ў дарослым жыцці, панясе ў свет. Калі выхоўваем дзіця ў атмасферы патрыятызму і пашаны традыцыі, яно ў будучыні, як дарослы чалавек, будзе шанаваць родную мову, будзе адчуваць з ёю сувязь і не адракнецца ад яе, дзе б лёс чалавека не кінуў:

«Слова – нясу праз жыццё.
Слова – не йдзі ў забыццё.
Слова – ў табе закаханы.
Слова – з табою з'яднаны.»

Мова з чалавекам усюды і ўсё жыццё, да апошніх хвілін жыцця:

«Слова – з табою памру.»

развітанне з ёю наступае тады, калі чалавек памірае.

«Слова – што іншым дару.»

Па-мойму, у гэтым радку гучыць прызнанне сябе творцам, паэтам, які піша на роднай мове і дорыць свае словы іншым людзям. Пасля яго смерці творы застануцца, як спадчына для нашчадкаў і наступных пакаленняў. Вядома, што слова мае ў сабе вялікую сілу.

Герой твора Сакрата Яновіча «Беларускаму слову» ідзе яшчэ далей у сваіх прызнаннях: «Беларускае слова, ты мая айчына!» Родная мова з'яўляецца ўсім, што заключаецца ў слове «айчына». Гэтыя словы не сказаны проста і спакойна, а голасна, станоўча і выразна, аб чым сведчыць клічнік у канцы фразы. Усё, што мае сувязь з дзяцінствам, тое, што ў жыцці добрае, прыемнае і спакойнае, герою асацыіруецца з роднай беларускай мовай: сон ля акна, пошум пушчы, весялосць, добры сябар, які не пакіне ў няшчасці. Як часы бестурботнага дзяцінства памятаецца ўсё жыццё, так і не забыць роднае мовы.

Мова прысутная ў жыцці людзей не толькі ў вясёлыя хвіліны, часам «слова матчынае – ты мая сляза!». У гэтым творы таксама вельмі інтымныя прызнанні героя: «Слова матчынае […] Мая трывога ў вечары кахання чыстаквецістага, у садзе юнацтва. І чарнабровы позірк дзяўчыны сарамлівай і бяссонне зорнае».

Мова асацыіруецца герою таксама з экзістэнцыальнымі пытаннямі пра лёс «у даляглядзе нязбытым», краіну прызначэння.

«[…] няспешна навучаеш мяне жыць сваім розумам ды гасцінцам ісці шырокім праз годы ўсяго раз адзін дадзеныя.» Тут мова, як цярплівая настаўніца. Яна заахвочвае да жыцця, якое атрымліваем толькі раз.

«Я табе толькі, слова ты маё беларускае, веру ды кланяюся.
Бог ты мой!
Ты мая рэлігія!»

Мова тут становіцца найвышэйшай вартасцю. Калі хрысціянін называе мову Богам і рэлігіяй, для яго, яна становіцца сакральнай, святой. Гэтыя словы прыдаюць твору пафасны характар.

Сакрат Яновіч выкарыстоўвае ў сваім творы метафару, як мастацкі сродак, дзякуючы якому, апісанні становяцца больш дынамічнымі, разнастайнымі і ўплываюць на ўяўленне адрасата.

У абодвух творах беларуская мова самая важная і самая дарагая, названа айчынай, Богам, рэлігіяй, значыць гэтым, што павінна з'яўляцца самым важным у жыцці кожнага чалавека. Мова гэта яго багацце. Дзякуючы ёй жыве народ, існуе гісторыя, традыцыя, памяць аб продках. Яна прысутная безупынна ў нашым жыцці, ад нараджэння да смерці. Яна заслугоўвае на нашую вялікую пашану.

Тэма 2: **Разважанні пісьменніка пра лёс айчыны. Аналіз і інтэрпрэтацыя твора Максіма Гарэцкага *Фантазія*.**

Максім Гарэцкі

Фантазія

Клубок Зямлі, агорнуты крывавым туманом і згараючы ў ім, рабіў свой вечны шлях у сістэме Сонца.

Найгусцей прыпаў туман на прасторы Беларусі.

Пад гулкі грукат гармат, траскатанне стрэльбаў і кулямётаў, пры водбліску страшных пажарышчаў раздаваліся дзікія воплі і балючыя стагнанні забіваных, рэзаных, паміраючых з голаду людзей.

Могілкі і турмы перапоўніліс. Грэх спавіў кожнае сэрца. Крывёю і слязьмі пазаплывалі вочы.

Сцені памёршых продкаў у смяротнай нудзе стаялі над распятай краінай і адварачываліся ад сваіх затопленых смуроднаю запечанай крывёй могілак.

З расцерзаным да краю сэрцам вялікага гуманіста вылез у поцемках з няведамай патомкам ямы панураны Францыск Скарына і падаўся ў начавым паветры да свайго радзімага Полацка.

Даўгія шырокія полы мантыі доктара лекарскіх і вызваленых навук развяваліся ад ветру, а яркі арэол наўкола сумнай галавы то разгараўся, то змяркаў.

Пралятаючы над слаба асвятлёным дзеля боязні аэрапланаў Менскам, сцень доктара шукаў вачмі таго шпіталя, дзе ляжаў пры смерці хворы з галадухі Янка Купала. Пабачыўшы над цёмным домам ззячую кружэлку арэолу песняра, сцень спусціўся ў ціхую палату і стаў над сваім нядужым сябрам.

- Як маешся, мой браце? – без слоў спытаўся доктар у стагнаўшага паэта.

Хворы з трудам заварушыўся і сумна паглядзеў на гуманіста.

- Не мукі цела страшны, - прачытаў Францыск Скарына ў кроткіх галубых вачах, - баліць душа.
- Лячу ў Полацак, хачу даведацца, што цяпер там? – сказаў цераз невялікае маўчанне доктар.
- Скрозь адно... Што тут, што ў Вільні, што ў Смаленску і скрозь на Бацькаўшчыне мілай... – пакратаў перасохшымі ад смагі вустамі паэт.

Доктар засмучона схіліўся галавою да грудзей і доўга так стаяў.

- На сход! – сказаў у непрытомнасці Янка Купала і збудзіў ад чорных дум паніклы сцень.
- Каму і на які? – азваўся рэхам сцень. Памаўчаў і прамовіў горка: - Магутны кліч твой раздаецца ўжо даўно – і скрозь, ад краю ў край, па Беларусі... А шмат з'явілася? Народ за доўгія вякі няволі аглох і зрабіўся нячулым.
- Што рабіць? – ізноў, як у гарачцы, застагнаў Купала.
- Што рабіць? – перапытаўся доктар, - тое, што ты і робіш. Але каб зразумеў народ наш паспаліты патрэбу сходу, ці не сабрацца спачатку толькі нам, будзіўшым яго на дабро ўсе вякі і кожны час?
- Добра... – прашаптаў паэт і сціх.

Сцень вылецеў з палаты і не падаўся далей к Полацку, а павярнуў назад к Ашмяншчыне.

Здалёку ўвідзеў ён на могілцы ў Жупранах вялікі яркі арэол народнага баяна.

Францыск Скарына спусціўся ля касцёла і чыркнуўся няўмысля палою мантыі аб спячага п'янога легіянера.

- Пся крэў! Холера! Быдло бялоруске! – закрычаў патурбаваны доктарам жандар, а яму рэхам адазваўся з-пад зямлі жудасна-балючы стон бацькі адраджэння.
- Не стагні, мой браце любы! Барзджэй бяры ты сваю "Дудку" й "Смык", пойдзем на сход склікаць! – сказаў яму заместа прывітання доктар.

З магілы ўзняўся сцень вусатай постаці.

- Засіпла мая дудка, а смык не маець скрыпкі... – безнадзейна пажаліўся Багушэвіч і дадаў, падумаўшы аб сваёй музе:

Каб ты так іграла,
Каб немарасць брала!...

- Твая "Дудка" грыміць, мой браце, на ўвесь край, а да "Смыка" дарабіла ж "Скрыпку" Цётка. Пойдзем зараз у Лідчыну на той вясковы могільнік, пабудзім на сход найперш яе, бо гэтая руплівая сяброўка склікаць умее найлепш за ўсіх.

І два сцені паляцелі побач у Лідчыну.

Поўная запалу і энергіі, хаця худзенькая і бледная, ляцела ўжо сама да іх пяснярка і паэтычна, ціханька пяяла ў адказ на свае думкі:

Можа, хто з дзетак скруце жалейку,
Унучку паломанай ліры.
І так заіграе, што ўсенька зямелька
Пачуе мой одгалас шчыры...

- Ах, браточкі-галубочкі! – загаманіла яна без дальніх слоў. – Трэба так: адзін на ўсход, другі на захад, а я з тым-сім паклічу тых, што спачываюць на чужыне, - і зараз паняслася.

Неўзабаве сцені памёршых і духі жывых сцякаліся на свой Парнас з усіх бакоў.

Пакашліваючы, брыў з далёкай Ялты калматабровы Максім Багдановіч. Спяшаўся, як заўсёды, з Галіцыі, з сваёй магілы ў Закапаным, запыханы Іван Луцкевіч. Глабаўся з-пад груду трупаў брацкай магілы ў Коўне Лявон Гмырак. Шыбка йшоў у хутры і ў зімовай сібірскай шапцы з Кракава даўгі Алесь Гарун. Важна і спакойна пасуваўся з Меншчыны пан Вінцук Дунін-Марцінкевіч. Як непрытомны прыбліжаўся з Кіева

празрыста-белы Сяргей Палуян з сінім шнурам на шыі... Прысадзіста калдыбаў разважны каранасты Карусь Каганец. Там ішлі яшчэ і другія.

А клубок Зямлі, згараючы ў крывавым тумане, ляцеў а ляцеў сваім вечным шляхам, як бы нічога не было.

1921

М. Гарэцкі, *Фантазія* (у:) М. Гарэцкі, *Творы*, Мінск 1995, с. 117-119

Temat 2.

«Клубок Зямлі, агорнуты крывавым туманом і згараючы ў ім, рабіў свой вечны шлях у сістэме Сонца.» Здавалася б звычайны час, проста чарговыя хвіліны ў доўгім жыцці Клубка Зямлі, чарговы звычайны дзень.

Аднак часу і падзей, паказаных Максімам Гарэцкім у творы пад загалоўкам «Фантазія», у ніякім выпадку нельга назваць звычайнымі. Там чуваць «гулкі грукат гармат, траскатанне стрэльбаў і кулямётаў, […] балючыя стагнанні забіваных, рэзаных, паміраючых з голаду людзей», відаць водбліск страшных пажарышчаў. У такі спосаб аўтар паказаў жудасны час вайны, калі «могілкі і турмы перапоўніліс ь. Грэх спавіў кожнае сэрца. Крывёю і слязьмі пазаплывалі вочы.» Гэтае апісанне перапоўненае панурасцю, сумам, безнадзейнасцю. Дзеянне адбываецца ноччу, што яшчэ больш павялічвае ступень сумнага настрою. У такой менавіта атмасферы Максім Гарэцкі ўваскрасіў постаці выдатных беларусаў. Іх духі ўстаюць з магілаў. Маюць аб’яднацца з мэтай абуджэння нацыянальных ідэалаў, якія недзе прапалі, загінулі і адышлі ў забыццё. Гэтым, хто меў уз’яднаць самых выдатных беларускіх пісьменнікаў і паэтаў, для якіх лёс Беларусі з’яўляўся найважнейшай справай, быў беларускі першадрукар, гуманіст, выбітны прадстаўнік культуры XVI стагоддзя – Францыск Скарына.

Усе беларускія паэты і пісьменнікі, якіх кліча дух Скарыны, узялі на сябе місію закліку «на сход», яднання народу, змагання, барацьбы за свабодную і незалежную Айчыну. Яны клапаціліся пра Беларусь і хацелі, каб яна смела магла глядзець у будучыню. Яны не проста чакалі светлага для сваёй Радзімы, толькі заклікалі змагацца за будучае. Незалежная дзяржава была іх галоўнай і найбольшай марай, якой падпарадкавалі ўсё свае жыццё і ўсю творчасць.

На пачатку твора дух Францыска Скарыны накіраваўся ў Мінск, і як першага наведаў народнага паэта Беларусі – Янку Купалу, які «ляжаў пры смерці хворы з галадухі». Аднак нягледзячы на гэта ён сцвердзіў, што «не мукі цела страшны […], баліць душа».

Мэтай Скарынаўскай вандроўкі быў Полацк. Ён хацеў даведацца, якія падзеі там адбываліся. Паводле Купалы такія ж самыя, як усюды, а жах, страх і сум былі іх галоўнай часткай. Купала ў непрытомнасці закліквaў «на сход». Скарына аднёсся да гэтага закліку даволі скептычна:

«Магутны кліч твой раздаецца ўжо даўно – і скрозь, ад краю ў край, па Беларусі... І шмат з'вілася? Народ за доўгія вякі няволі аглох і зрабіўся нячулым». Абое дайшлі да вываду, што пачаткова павінны сабрацца тыя, якія на працягу доўгіх гадоў стараліся будзіць свядомасць народа сваёй творчасцю. Яны лічылі, што дзякуючы таму, увесь беларускі народ урэшце адчуе патрэбу змен і барацьбы за лепшую будучыню. Каб так магло атрымацца, дух Скарыны «паляцеў» будзіць абаронцу правоў прыгнечанага беларускага сялянства і бацьку адраджэння – Францішка Багушэвіча, аўтара зборнікаў паэзіі «Дудка беларуская» і «Смык беларускі», аўтара незабыўных слоў з прадмовы да зборніка «Дудка беларуская»: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмерлі!» Пасля прабуджэння, Францішак Багушэвіч аднак сцвердзіў, што яго дудка не іграе ўжо так, як калісьці, а смык не мае скрыпкі. На гэта пачуліся словы Скарыны: «Твая Дудка грыміць, мой браце, на ўвесь край, а да Смыка дарабіла ж Скрыпку Цётка». Алаіза Пашкевіч, вядомая ў беларускай літаратуры як Цётка, была чарговым творцам пакліканым «на сход». Была яна «поўная запалу і энергіі, хаця худзенькая і бледная». Як у паэзіі, так і ў прозе, ва ўсёй творчасці Цёткі, гучалі рэвалюцыйна – вызваленчыя матывы. Пісьменніца глыбока верыла ў барацьбу і мужнасць, і як паэтка – рэвалюцыянерка, заахвочвала да гэтага іншых. На яе жыццё, паэзію і прозу, значна паўплывала творчасць яе папярэднікаў, а перш за ўсё Францішка Багушэвіча. Нават назва яе зборніка паэзіі – «Скрыпка беларуская», асацыіруецца з назвамі зборнікаў Багушэвіча «Дудка беларуская» і «Смык беларускі».

Словы твораў, як Багушэвіча, так і Цёткі, павінны былі гучаць выразна і голасна сярод беларускага народа, «іграць» самую звонкую музыку праўды, мелі гучаць голасна і без перапынку.

На заклік Цёткі, Францішка Багушэвіча і Францыска Скарыны, дзе кожны з іх пайшоў у іншым напрамку – адзін на ўсход, другі на захад, а Цётка «паляцела» склікаць па-за межы краіны, неўзабаве пачалі з'яўляцца новыя постаці. Прыляцелі духі, між іншым, Максіма Багдановіча, Алеся Гаруна, Вінцука Дунін – Марцінкевіча ды іншых. У іх была мэта: дапамагчы аб'яднаць беларускі народ. Гэта была нялёгкая ў рэалізацыі мэта і адначасова вельмі адказная місія.

Максім Гарэцкі стварыў у творы адпаведны настрой з дапамогай сваіх уяўленняў і фантазіі, што ўжо выразна відаць у загалоўку тэксту.

У творы «Фантазія» нельга адназначна акрэсліць ні часу, ні прасторы. Тут сучаснасць пераплятаецца з мінулым, рэалізм – з фантастыкай, жывыя постаці – з духамі і ценямі памёршых выдатных постацяў беларускай літаратуры розных перыядаў. Усё гэта Максім Гарэцкі выкарыстоўвае, каб стварыць адпаведны настрой, каб магчы выказаць свае думкі, каб прымусіць чытача задумацца над важнай і заўсёды актуальнай тэмай лёсу сваёй Айчыны. Што калісьці рабілі людзі,

каб свой лёс і лёс сваёй Радзімы стаў лепшым? Што кіравала іхняй дзейнасцю? Аб чым думалі і якія былі іхнія мары?

«А Клубок Зямлі, згараючы ў крывавым тумане, ляцеў а ляцеў сваім вечным шляхам як бы нічога не было.»